**УДК 94,438 ("1924-1927")**

# АГРАРНАЕ ПЫТАННЕ Ў ПРАГРАМЕ НЕЗАЛЕЖНАЙ СЯЛЯНСКАЙ ПАРТЫІ (1924 – 1927)

***В.П. ГАРМАТНЫ***
***(Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Даследуецца аграрнае пытанне ў праграме Незалежнай Сялянскай Партыі (НСП) ў 1924 – 1927 гадах, паказаны яе падыходы да вырашэння зямельнага пытання. На працягу ўсяго перыяду існавання ІІ Рэчы Паспалітай (1921 – 1939) аграрнае пытанне было адным з самых злабадзённых, ад вырашэння якога залежыў далейшы лёс дзяржавы. Незалежная Сялянская Партыя прапанавала ўласны праект ажыццяўлення аграрных пераўтварэнняў, якія былі занадта радыкальны і таму не знайшоў падтрымкі Сейма. Зроблена выснова, што партыя адыграла важную ролю ў сялянскім руху ІІ Рэчы Паспалітай, яе ідэі карысталіся сярод тагачаснага сялянства вялікай папулярнасцю.*

**Уводзіны.** Незалежная Сялянская Партыя (Niezależna Partia Chłopska, НСП) узнікла пасля расколу 11 лістапада 1924 года ў Польскай Народнай Партыі-"Вызваленне" (Polskie Stronnictwo Ludowe-"Wyzwolenie", ПНП-"Вызваленне"), выкліканага супярэчнасцямі ў адносінах да ўрада на чале з Уладзіславам Грабскім (Władysław Grabski) і законапраекта аграрнай рэформы, а таксама актыўнай агітацыі Камуністычнай партыі Польшчы (КПП, Komunistyczna Partia Polski) [11, s. 15]. Паслы (дэпутаты) Сейма ІІ Рэчы Паспалітай ад Заходняй Беларусі Адольф Бон (Adolf Bon), Фелікс Галавач (Feliks Hołowacz), Антоні Шапель (Antoni Szapiel) і Сільвестр Ваявудскі (Sylwester Wojewódzki) выйшлі з шэрагаў "Вызвалення" [3, s. 271; 4, s. 77] і абвясцілі аб заснаванні новага сеймавага пасольскага клуба, які насіў выразна сялянскую накіраванасць. Аўтарам назвы ствараемай партыі – НСП – стаў Ф. Галавач [8, s. 25].

Непасрэднай прычынай выхада азначаных палітыкаў з шэрагаў "Вызвалення" стала галасаванне аб вотуме даверу ўраду: у той час як ПНП-"Вызваленне" галасавала за давер, Бон і яго аднадумцы прагаласавалі супраць. Свой выхад з партыі палітыкі абгрунтоўвалі сцвярджэннем, што калі ўступалі ў "Вызваленне", то верылі, што будуць змагацца за ўладу, зямлю і адукацыю для працоўнага народа, але, на іх думку, партыя адыйшла ад ранейшых лозунгаў і перайшла на пазіцыі супрацоўніцтва з памешчыкамі і буржуазіяй [16, s. 143 – 144]. Разам з тым прадстаўнікі НСП не адмаўлялі заслуг ПНП-"Вызваленне" і ў перспектыве супрацоўніцтва з ёю [13, s. 122; 15, s. 145 – 147].

**Асноўная частка.** У лістападзе 1924 года прадстаўнікі сеймавага клуба НСП выдалі дэкларацыю аб намерах дзейнасці, у якой адзначылі, што "жадаюць быць голасам і сумненнем вясковага насельніцтва". У якасці галоўных праграмных мэт НСП былі вызначаны змена падатковага заканадаўства з перанясеннем большасці падаткаў на плечы заможных класаў, адзяржаўленне лясоў, бясплатная свецкая адукацыя на бацькоўскай мове вучняў, аддзяленне царквы і касцёла ад дзяржавы і барацьба з "памешчыцка-буржуазным мілітарызмам і імперыялізмам" [12, s. 53 – 55].

Працэс пераўтварэння нешматлікага сеймавага пасольскага клуба ў сапраўдную палітычную партыю заняў даволі працяглы час. З пачатку 1925 года заснавальнікі партыі разгарнулі актыўную арганізатарскую дзейнасць па стварэнні сеткі ваяводскіх і павятовых партыйных камітэтаў. Першапачаткова ў склад НСП уваходзілі 6 паслоў Сейма (заснавальнікі, Станіслаў Балін, Stanisław Ballin, і Уладзімір Шакун, Włodzimierz Szakun) [3, s. 274] і каля 800 чытачоў газеты "Wyzwolenie Ludu" ("Вызваленне сялянства"), а ўжо ў студзені 1925 года партыя мела каля 1 000 прыхільнікаў, галоўным чынам у Заходняй Беларусі [8, s. 56].

У сакавіку 1925 года ў Варшаве створаны Галоўны сакратарыят (Sekretariat Główny), які кіраваў прапагандысцкай і арганізатарскай дзейнасцю, акрамя таго ў шэрагі НСП перайшоў адзін з актыўных паслоў ПНП-"Вызваленне" доктар Альфрэд Федаркевіч (Alfred Fiderkiewicz) і стаў старшынёю Прэзідыума Пасольскага клуба НСП [12, s. 67; 13, s. 123]. Рэдактарам партыйных органаў, якія з-за частых канфіскацый паліцыяй выходзілі пад рознымі назвамі, быў С. Ваявудскі. Усяго з 1924 па 1927 год партыя выдала 114 нумароў штотыднёвай газеты (у асноўным пад назваю "Незалежны селянін", "Niezależny Chłop", 20 нумароў канфіскавана), 8 брашур, 27 лістовак і некалькі адозваў [7, s. 31; 16, s. 150].

Прадстаўнікі пасольскага клуба НСП вельмі актыўна дзейнічалі ў парламенце і за ўвесь перыяд існавання партыі (1924 – 1927) не было такога месяца, каб сеймавыя стэнаграмы не зафіксавалі выступленняў членаў партыі [12, s. 84]. Паслы НСП выкарыстоўвалі сеймавую трыбуну для прапаганды сваіх ідэй і вострай крытыкі польскага ўрада, дзейнічаючы ў цеснай звязцы з прадстаўнікамі іншых левых партый, прадстаўленых у Сейме ІІ Рэчы Паспалітай [7, s. 26; 16, s. 222].

Фракцыя НСП разам з пасольскімі клубамі КПП і Беларускай Сялянска-Рабочай Грамады (БСРГ, Białoruska Włościańsko-Robotnicza Hramada) 26 чэрвеня 1925 года ўнесла на разгляд маршалку (старшыні) Сейма ІІ Рэчы Паспалітай Мацею Ратаю (Maciej Rataj, ПНП-"Пяст", PSL-"Piast") сумесны праект ажыц-

цяўлення ў краіне аграрнай рэформы [5, s. 168], які прадугледжваў спыненне насаджэння на землях Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны асаднікаў (перасяленцаў-каланістаў з карэннай Польшчы) і перадачу на карысць малазямельных і беззямельных сялян без усялякага выкупу памешчыцкіх маёнткаў звыш 30 га, а таксама бясплатнае надзяленне іх лесам. Законы аб аграрнай рэформе ад 10 ліпеня 1919 года і 15 ліпеня 1920 года ацэньваліся пасламі азначаных партый як ашуканскія [15, s. 105, 112]. Такі радыкальны закон аб аграрнай рэформе не мог знайсці падтрымку ў Сейме, і ў выніку за яго прагаласавалі толькі прадстаўнікі левых сіл.

У гэты ж дзень у Сейме адбылося другое чытанне ўрадавага праекта аграрнай рэформы, падчас абмеркавання якога першым выступіў А. Бон і адзначыў, што: 1) прапануемы законапраект дае памешчыкам свабоду рук падчас парцэляцыі (падзелу зямель) і гарантуе ім абарону; 2) не вызначае максімум кошту на памешчыцкія землі, чым могуць скарыстацца абшарнікі і спекуляцыйна ўзняць цэны; 3) абмяжоўвае парцэляцыю да 200 000 га штогод; 4) парцэляцыя будзе ажыццяўляцца занадта павольна; 5) закон не ўтрымлівае пастановы аб надзяленні зямлёю малазямельных і беззямельных сялян, а, наадварот, заахвочвае насаджэнне асадніцтва на новадалучаных землях; 6) закон дазваляе памешчыкам мець зямлі звыш 180 га; 7) пастанова аб парцэляцыі 200 000 га штогод можа быць перанесена на іншы год, што будзе на карысць памешчыкам, якія могуць адцягваць яе на нявызначаны тэрмін; 8) закон не закранае лясных абшараў [8, s. 85 – 86].

Асаблівая дыскусія разгарэлася падчас абмеркавання артыкула 4 (аб максімуме памешчыцкага землеўладання) і артыкула 27 (аб кошце выкупа зямлі ў памешчыкаў). Пасол Балін выступіў з прапановаю аб канфіскацыі без выкупу памешчыцкай зямлі звыш 30 га (у некаторых рэгіёнах звыш 60 га) і перадачы разам з усімі забудовамі і інвентаром мясцовым сялянам, але маршалак Сейма Мацей Ратай увогуле не паставіў яе на галасаванне як супярэчлівую Канстытуцыі [5, s. 177]. Ніводзін з іншых законаў не выклікаў такой гарачай дыскусіі, як закон аб аграрнай рэформе [10, s. 177]: падчас другога чытання ў Сейме пасламі прапанавана 600 папраўак у яго змест, у асноўным ад НСП і ПНП-“Вызваленне”, падчас трэцяга – 400.

Сеймавыя прамовы прадстаўнікоў НСП часта выходзілі за рамкі дазволенага ў паламенце, з-за чаго маршалку Сейма прыходзілася заклікаць выступаючых да парадку ці нават аб’яўляць перапынак. Так, напрыклад, пасол Ст. Балін выступіў 2 ліпеня 1925 года ў Сейме II Рэчы Паспалітай з прамовай, у якой падкрэсліў, што НСП “змагаецца за тое, каб канфіскаваць у памешчыкаў (зямлю) не толькі для таго, каб пазбавіць іх магчымасці эксплуатаваць чужую працу і жыццё з яе, але найперш за ўсё для таго, каб адабраць у іх асновы ўлады палітычнай, адабраць у іх тое, што дае магчымасць уціску 22 мільёнаў сялян і рабочых” [8, s. 131]. Такім чынам, НСП выступала за ліквідацыю памешчыкаў як класа навогуле.

Падчас галасавання па артыкулу 27 законапраекта паслы Балін і Ваяводскі 18 ліпеня 1925 года былі выключаны з удзелу ў двух пасяджэннях Сейма. 20 ліпеня 1925 года падчас галасавання па праекту аграрнай рэформы за біццё ў пульпіты, спевы і свіст Ваяводскі, Федаркевіч і Шакун выключаны з удзелу на трох, а Бон – на адным пасяджэнні [12, s. 83]. Нягледзячы на актыўны супраціў левых сіл, законапраект аб аграрнай рэформе быў правацэнтрысцкаю бальшынёю Сейма прыняты, а 28 снежня 1925 года зацверджаны Сенатам [4, s. 132; 5, s. 177].

Аграрная рэформа 1925 года прадугледжвала правядзенне прымусовай парцэляцыі з выкупам памешчыцкіх маёнткаў звыш 60 га ў прамысловых акругах і 180 га ў іншых рэгіёнах, ажыццяўленне камасацыі (аб’яднання раскіданых сялянскіх зямельных надзелаў), надзяленне сялян зямлёю за выкуп, ліквідацыю сервітутаў (права агульнага сумеснага карыстання сялян і памешчыкаў пашаю, лесам, рэкамі і г.д.) [6, s. 36 – 37; 9, s. 262], і ў цэлым прадугледжвала эвалюцыйнае ажыццяўленне ў дзяржаве аграрных пераўтварэнняў у рамках існуючых на той час эканамічных магчымасцяў.

Са стварэннем даволі шмалікай і добра арганізаванай партыі кіраўніцтва НСП пастанавіла апрацаваць яе праграму і статут, што і было ажыццёўлена 25 кастрычніка 1925 года на партыйнай канферэнцыі ў Варшаве. Абодва дакументы былі выдадзены ў снежні 1925 года ў форме брашур, а ў чэрвені 1926 года з-за актыўнага попыту перавыдадзены [8, s. 125].

Заснаваная на ідэях папярэдняй дэкларацыі, але больш змястоўная і канкрэтызаваная праграма партыі і Статут НСП прыняты 20 лістапада 1925 года Галоўнаю ўправаю (Zarząd Główny) партыі. Галоўная ўправа партыі 31 снежня 1925 года пераіменавана ў Цэнтральны Камітэт (ЦК, Komitet Centralny) НСП, на чале якога стаў А. Федаркевіч [12, s. 68].

У адрозненне ад іншых тагачасных палітычных партый II Рэчы Паспалітай, якія дабіваліся дасягнення пастаўленых у праграмах задач шляхам мірнай парламенцкай барацьбы, НСП падкрэслівала, што правесці аграрную рэформу на карысць бальшыні сялянства зможа толькі рабоча-сялянскі ўрад, усталявання якога і дабівалася партыя [7, s. 29; 8, s. 129]. Прынятыя праграма і статут разглядаліся як часовыя і абавязковыя да склікання Кангрэсу – вышэйшай партыйнай інстанцыі, якая павінна была зацвердзіць праграму альбо выпрацаваць іншую [10, s. 189].

У прынятай праграме партыі аналізавалася палітычная сітуацыя ў свеце і асабліва ў Польшчы, падкрэслівалася вельмі цяжкае становішча сялянства II Рэчы Паспалітай, якое складала бальшыню насельніцтва (каля 65 %) і было ў дзяржаве “шэраю масаю, з якой адны жывуць, якую іншыя ашукваюць” [14, s. 248].

На думку лідараў НСП, ворная зямля ў Польшчы на той час была падзелена вельмі несправядліва [6, s. 35; 10, s. 177]: вялікія абшары зямлі знаходзіліся ў руках тых, хто не працуе на ёй (памешчыкі), а толькі выкарыстоўвае сваё права ўласнасці для эксплуатацыі тых, хто на ёй працуе (сялян). Адзіным магчымым выхадам з такога неадпаведнага часу становішча з'яўлялася канфіскацыя памешчыцкай зямлі і перадача яе малазямельным і беззямельным сялянам без усялякага выкупа разам з усім неабходным сельскагаспадарчым інвентаром і пабудовамі [16, s. 147]. У праграме партыі адзначалася, што势 плануемы падзел зямлі павінны ажыццяўляць не ваяводскія і павятовыя зямельныя ўправы, якія “не ведаюць сялянскіх патрэб”, а выбраныя непасрэдна сялянамі зямельныя камісіі. Паводле вызначэння сялянскіх камісій некаторыя буйныя памешчыцкія гаспадаркі з улікам эканамічнай мэтазгоднасці могуць так і застацца непадзеленымі і перайсці ў грамадскае карыстанне [14, s. 254].

Незалежная Сялянская Партыя ўсяляк прапагандавала думку, што велічыня зямельнага надзела не павінна была перавышаць таго памеру, які селянін мог апрацаваць самастойна без наёмнай сілы. Пасол А. Бон вызначаў абшар такога сярэдняга надзела ад 8 да 20 маргоў (4 – 10 га) [8, s. 130]. Дзяржава павінна была ўсяляк спрыяць новаствораным сялянскім гаспадаркам праз аказанне найперш за ўсё грашовай дапамогі, а таксама доўгатэрміновых банкаўскіх пазык для іншых катэгорый сялянства. Усе мерапрыемствы па меліярацыі і камасацыі павінны былі быць выкананы за дзяржаўны кошт. Лясы, рэкі і азёры, якія раней належалі памешчыкам, павінны былі праз сялянскія камісіі быць аддзяржаўлены [14, s. 254 – 255].

Росквіт НСП прыпадае на 1926 – 1927 гады, калі ўзнікла шмат новых гурткоў партыі, а колькасць членаў ужо існуючых значна павялічылася. Па стане на сакавік 1927 года колькасць членаў НСП дасягнула 10 000, а з улікам сталых чытачоў партыйнай перыёдыкі – 20 000 чалавек [9, s. 242], што дало ЦК партыі на пасяджэнні 5 лютага 1927 года падставу прызначыць тэрмін Кангрэса на 27 сакавіка 1927 года. У Кангрэсе павінны былі прыняць удзел па тры дэлегаты ад ваяводскіх і павятовых арганізацый, члены ЦК НСП і яе сеймавага пасольскага клуба, а таксама “надзейныя мужы” [12, s. 94].

Вестка аб плануемым скліканні Кангрэса НСП выклікала рэзкую незадаволенасць польскіх уладаў, якія і да гэтага ставіліся да партыі вельмі непрыхільна з-за яе радыкальнай праграмы і сталых кантактаў з камуністамі. Сёмага сакавіка 1927 года выдадзена патаемнае распараджэнне міністра ўнутраных спраў ІІ Рэчы Паспалітай Феліцыяна Славоя Сладкоўскага (Felicjan Sławoj Składkowski) да ваявод і ўрадавага камісара ў Варшаве аб роспуску НСП з дня 21 сакавіка 1927 года. На падставе распараджэння міністра ўнутраных спраў ваяводы распрацавалі ўласныя пастановы аб ліквідацыі сялянскай партыі і патаемна разаслалі іх да ўсіх павятовых старост [8, s. 314 – 316].

Варта таксама адзначыць, што 15 студзеня 1927 года польскімі ўладамі забаронена БСРГ, а сеймавыя паслы Браніслаў Тарашкевіч, Павел Валошын, Сымон Рак-Міхайлоўскі абвінавачаны ў падрыўной дзейнасці супраць польскай дзяржавы і, нягледзячы на сваю парламенцкую недатыкальнасць, арыштаваны паліцыяй і пасаджаны ў турму. На наступны дзень пасол Ф. Галавач ад НСП і Пётр Мятла ад БСРГ арыштаваны па гэткаму ж самаму абвінавачванню [12, s. 94].

Дваццаць першага сакавіка 1927 года было абвешчана распараджэнне аб роспуску і забароне НСП як камуністычнай арганізацыі, цесна супрацоўнічаючай з КПП і ставячай на мэце гвалтоўную змену ўрада і канстытуцыйнага ладу дзяржавы. На наступны дзень на пасяджэнні ЦК НСП было прааналізавана становішча партыі, а пасол ад КПП Адольф Варскі-Варшаўскі (Adolf Warski-Warszawski) выступіў з вострым пратэстам супраць забароны НСП [13, s. 134], але маршалак Сейма забраў у яго голас.

Пасольскі клуб НСП 24 сакавіка 1927 года выступіў з заявaю, што, нягледзячы на незаконнае распараджэнне, партыя застаецца легальнай масавай сялянскай арганізацыяй і надалей будзе дзейнічаць у рамках Канстытуцыі ІІ Рэчы Паспалітай па дасягненні пастаўленых у праграме мэт, але фактычна гэта была толькі дэкларацыя [8, s. 321 – 322]. Пад кіраўніцтвам КПП была арганізавана шырокая пратэстная кампанія супраць роспуску НСП, але рэальных вынікаў яна не дала.

Вестка аб роспуску партыі выклікала неадназначную рэакцыю яе членаў. Сеймавыя паслы Бон, Шакун і Шапель выступілі з крытычнаю ацэнкаю рэвалюцыйнай тактыкі НСП і з перасцярогаю барацьбы з урадам, вынікам чаго стала стварэнне новай палітычнай арганізацыі – Радыкальнай Сялянскай Партыі Беларускіх Зямель (Radykalnej Partii Włościańskiej Ziem Białoruskich). Новая партыя на працягу 1927 года змяніла назву на Сялянскую Левую Партыю (Chłopska Partia Lewicowa), мела невялікую колькасць членаў, галоўным чынам сярод заходнебеларускіх сялян, і дзейнічала толькі да вясны 1928 года [7, s. 34; 15, s. 16; 16, s. 223].

Іншыя члены НСП не падпарадкаваліся рашэнню польскіх уладаў і на патаемнай нарадзе ў красавіку 1927 года пастанавілі падтрымліваць канспіратыўную сувязь з былымі членамі і суполкамі партыі, але стварыць новыя гурткі ў такіх неспрыяльных умовах не ўдалося [10, s. 448].

**Заключэнне.** Нягледзячы на непрацяглы перыяд свайго існавання (1924 – 1927 гг.), Незалежная Сялянская Партыя адыграла важную ролю ў сялянскім руху ІІ Рэчы Паспалітай, яе ідэі карысталіся сярод тагачаснага сялянства вялікай папулярнасцю. У шэрагах партыі знаходзілася галоўным чынам беднейшая частка сялянства ІІ Рэчы Паспалітай, інтарэсы якіх партыя абараняла мэтанакіравана і паслядоўна.

Па аграрнаму пытанню НСП адносілася да крайне левых партый, выступала за перадачу малазямельным і беззямельным сялянам без усялякага выкупа памешчыцкай зямлі, што ў тагачасных умовах было немагчыма, а таксама за саюз рабочых і сялян у дасягненні пастаўленых задач. Незалежная Сялянская Партыя знаходзілася пад значным ідэйным уплывам Камуністычнай партыі Польшчы, што і прадвызначыла яе далейшы лёс – роспуск і забарону польскімі ўладамі.

ЛІТАРАТУРА

1. Гецевич, А.К. Деятельность Независимой Крестьянской Партии на территории Западной Беларуси (1924 – 1927) / А.К. Гецевич // Вести Института Современных Знаний. – 2006. – № 1. – С. 20 – 24.
2. Политические партии в Польше, Западной Белоруссии и Западной Украине / под ред. С. Скульского. – Минск: Изд-во Белорус. Акад. Наук, 1935. – 336 с.
3. Bełcikowska, A. Stronnictwa i związki polityczne w Polsce: charakterystyki, dane historiczne, programy, rezolucje, organizacje partyjne, prasa, przywódcy / A. Bełcikowska. – Warszawa: Dom Książki Polskiej, 1925. – 1086 s.
4. Brzoza, Cz. Polska w czasach niepodległości i II Wojny Światowej (1918 – 1945) / Cz. Brzoza. – Kraków: Fogra, 2001. – 424 s.
5. Burger, W. Ruch ludowy wobec kwestii społeczno-ustrojowych II Rzeczypospolitej / W. Burger. – Szczecin: Wyższa Szkoła Morska, 1983. – 414 s.
6. Ciepielewski, J. Stronnictwa i partie polityczne wobec kwestii rolnej i chłopskiej w Polsce międzywojennej / J. Ciepielewski. – Warszawa: Centralna Szkoła Partyjna przy KC PZRP, 1969. – 71 s.
7. Cimek, H. Legalne chłopskie partie rewolucyjne w Drugiej Rzeczypospolitej / H. Cimek. – Białystok: Krajowa Agencja Wydawnicza, 1988. – 157 s.
8. Dymek, B. Niezależna Partia Chłopska (1924 – 1927) / B. Dymek. – Warszawa: Książka i Wiedza, 1972. – 455 s.
9. Historia chłopów polskich: w 3 t. T. 3. Okres II Rzeczypospolitej i okupacji hitlerowskiej / pod redakcją St. Inglota. – Warszawa: Ludowa Spółdzielna Wydawnicza, 1980. – 715 s.
10. Holzer, J. Mozaika polityczna Drugiej Rzeczypospolitej / J. Holzer. – Warszawa: Książka i Wiedza, 1974. – 670 s.
11. Jachymek, J. Rozłamy w ruchu ludowym (do 1939) / J. Jachymek // Roczniki z Dziejów Ruchu Ludowego. – 2008. – № 35. – S. 3 – 25.
12. Jarecka, St. Niezależna Partia Chłopska (1924 – 1927) / St. Jarecka. – Warszawa: Ludowa Spółdzielnia Wydawnicza, 1961. – 187 s.
13. Mioduchowska, M. Klub Poselski Niezależnej Partii Chłopskiej w obronie mas chłopskich / M. Mioduchowska // Roczniki z Dziejów Ruchu Ludowego. – 1959. – № 1. – S. 120 – 134.
14. Programy partii i stronnictw politycznych w Polsce w latach 1918 – 1939. – Rzeszów: Wyższa Szkoła Pedagogiczna w Rzeszowie, 1993. – 456 s.
15. Wybór publicystyki Niezależnej Partii Chłopskiej / wstęp i wybór A. Łuczak, K. Przybysz. – Warszawa: Ludowa Spółdzielnia Wydawnicza, 1975. – 220 s.
16. Zarys historii polskiego ruchu ludowego. W 2 tomach. T. 2, 1918 – 1939 / J. Borkowski [et al.]. – Warszawa: Ludowa Spółdzielnia Wydawnicza, 1970. – 602 s.

*Паступіў 05.06.2013*

**AGRARIAN QUESTION IN THE PROGRAM OF INDEPENDENT PEASANT PARTY (1924 – 1927)**

***V. HARMATNY***

*The agrarian question in the program of Independent Peasant Party (IPP, 1924 – 1927) is studied, its positions to the solving of the agrarian problem are shown. During the whole period of II Rzeczpospolita (1921 – 1939) the agrarian question was one of the most important, which the future of the country depended on. The Independent Peasant Party proposed its own project of agrarian changes, which was very radical and wasn't understood by the Sejm. The party played an important role in the peasant movement of II Rzeczpospolita, its ideas were popular among the peasantry of that period.*